**Ю.А.Пераверзева**, *старшы выкладчык*

# НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЫСЦЫПЛІНЫ СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ “БІБЛІЯТЭЧНЫ ФАНДРЭЙЗІНГ”

Падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў па пытаннях тэорыі, методыкі і арганізацыі дзейнасці па пошуку крыніц паза-бюджэтнага фінансавання з’яўляецца актуальным кірункам прафесійнай адукацыі.

Навучанне бібліятэкараў асновам фандрэйзінгу ажыццяўляецца ў буйнейшых ВНУ Садружнасці Незалежных Дзяржаў і адпавядае каштоўнасна-мэтавым прыярытэтам развіцця бібліятэчнай справы. Навукова-метадычнае суправаджэнне навучальнага працэсу прадвызначае наяўнасць тыпавых вучэбных праграм па курсе “Бібліятэчны фандрэйзінг” і праграм павышэння кваліфікацыі; курсаў лекцый і метадычных рэкамендацый і інш. [1; 2; 3; 4; 5; 6]. Існуючыя напрацоўкі па бібліятэчным фандрэйзінгу можна аб’яднаць у некалькі груп:

– работы, якія раскрываюць агульныя тэндэнцыі фарміравання тэорыі бібліятэчнага фандрэйзінгу (А.У.Башун, В.Г.Дрыгайла, У.К.Клюеў, Ю.А.Пераверзева);

– матэрыялы, прысвечаныя распрацоўцы арганізацыйных механізмаў бібліятэчнага фандрэйзінгу і прыёмаў кіравання гэтай дзейнасцю (Б.А.Лібергер, В.М.Суворава, І.М.Суслава, С.У.Штукарова);

– матэрыялы, якія адлюстроўваюць аўтарскія методыкі пошуку пазабюджэтнага фінансавання бібліятэк (Н.В.Жадзько, Л.Г.Кірухіна, П.Молхалт, А.А.Пурнік);

– матэрыялы, што ўтрымліваюць фармалізаваны практычны вопыт бібліятэк у галіне фандрэйзінгу (Я.Э.Еўсцігнеева, Г.Д.Кавальчук, У.М.Сарока, А.Б.Стогній).

Асаблівасці прац па бібліятэчным фандрэйзінгу абумоўлены зместам навучання па гэтым курсе. Змест названай дысцыпліны ўлічвае:

– міжпрадметныя сувязі, калі, напрыклад, распрацоўка бібліятэчнай мэтавай праграмы ці праекта ажыццяўляецца з улікам ведаў аб прынцыпах арганізацыі бібліятэчных сетак; відавых і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тыпалагічных асаблівасцях бібліятэк; псіхолага-педагагічных аспектаў бібліятэчнага абслугоўвання і інш.;

– актуальныя кірункі развіцця бібліятэчнай справы і ролі бібліятэк у сацыяльна-эканамічнай і інфармацыйных галінах жыццядзейнасці;

– працэсы дзяржаўнага рэгулявання і стымулявання дзейнасці бібліятэк;

– сістэму адносін, уласцівую ўзаемадзеянню выкладчыка і студэнтаў;

– наяўнасць профільнага фонду інфармацыйных рэсурсаў;

– магчымасці ўкаранення ў работу бібліятэк вынікаў практычнай вучэбнай дзейнасці.

Структура і змест навукова-метадычнага забеспячэння дысцыпліны спецыялізацыі “Бібліятэчны фандрэйзінг” арыентаваныя на інтэнсіфікацыю вучэбнага працэсу, павышэнне яго прадукцыйнасці. Асаблівае значэнне надаецца пабудове адкрытай адукацыйнай сістэмы, якая ў сукупнасці з арганізацыйнымі формамі навучання забяспечвае магчымасць выбару студэнтамі ўласнай траекторыі вучэбнай дзейнасці і самаадукацыі, развіцця творчага патэнцыялу, здольнасцей да камунікатыўных дзеянняў, рэалізацыі сацыяльнага заказу.

Працэс выкладання курса “Бібліятэчны фандрэйзінг” базіруецца на модульным варыянце вучэбна-метадычнага комплексу (далей – ВМК). Выбар гэтага падыходу да фарміравання ВМК абумоўлены магчымасцю структуравання вучэбнага матэрыялу згодна логіцы выкладання і накіраваны на паслядоўнае рашэнне пастаўленай вучэбнай задачы. Таму атрыманне тэарэтычных ведаў і набыццё практыка-арыентаванай кампетэнцыі разглядаецца ў кантэксце арганізацыйна-змястоўных прынцыпаў праектавання дыдактычнага працэсу і здзяйснення рэфлексіі зыходзячы з канкрэтных умоў адукацыйнага асяроддзя (колькасці аўдыторных і пазааўдыторных заняткаў, кіруемай самастойнай работы, ступені падрыхтаванасці студэнтаў, форм бягучага і выніковага кантролю, інфармацыйнага забеспячэння вучэбнага працэсу, зручнасці выкарыстання вучэбна-метадычных матэрыялаў і інш.).

Дысцыпліна структуравана па раздзелах і вучэбных элементах (тэмах), якія з’яўляюцца адносна самастойнымі дыдактычнымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адзінкамі. Першы раздзел “Тэарэтычныя асновы бібліятэчнага фандрэйзінгу” прадугледжвае замацаванне сутнасных параметраў і катэгорый фандрэйзінгавай дзейнасці, асноўных канцэпцый і працэдур яе рэалізацыі. Другі раздзел “Бібліятэчны фандрэйзінг: арганізацыйна-тэхналагічны аспект” забяспечвае набыццё практычных навыкаў і ўменняў па распрацоўцы бібліятэчных мэтавых праграм і праектаў, укараненні сацыяльнага партнёрства, падтрымцы дабрачынных ініцыятыў у адносінах бібліятэк.

Пабудова ВМК па бібліятэчным фандрэйзінгу на аснове сістэмнага аналізу дазваляе праектаваць логіка-сімвалічную мадэль фандрэйзінгавай дзейнасці, дзе асаблівая ўвага належыць яе суб’ектам і аб’ектам, рэсурсам, інфармацыйным і грамадскім сувязям, фактарам абмежаванасці па крытэрыях даступнасці, якасці і эфектыўнасці.

Кожны вучэбны элемент уяўляе сабой асобны закончаны функцыянальны блок, прыстасаваны для самастойнага засваення студэнтамі. У ім змешчаны акадэмічныя тэксты, метадычныя рэкамендацыі па выкананні практычных заданняў, пытанні для кантролю і самакантролю, дадаткі, спісы літаратуры.

У сістэме навучання бібліятэчнаму фандрэйзінгу выкарыстоўваюцца:

– традыцыйныя віды заняткаў;

– актыўныя формы рэалізацыі вучэбнага працэсу, сярод якіх дзелавыя гульні, круглыя сталы, спецсемінары і інш.;

– работа ў малых групах, накіраваная на набыццё кампетэнцыі па стварэнні структурна-лагічных схем узаемадзеяння бібліятэк з рознымі катэгорыямі дабрачынцаў;

– методыкі практычнага навучання, пабудаваныя па прынцыпе алгарытмізацыі дзеянняў бібліятэчных спецыялістаў – арганізатараў фандрэйзінгу;

– тэхналогіі падрыхтоўкі і пазіцыянiравання бібліятэчных мэтавых праграм і праектаў;

– аўтаматызаваныя і мультымедыйныя сродкі, магчымасці сеткавага ўзаемадзеяння паміж удзельнікамі фандрэйзінгу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Атрыманне якаснай адукацыі ў галіне бібліятэчнага фандрэйзінгу вызначаецца пэўнымі патрабаваннямі да зместу і арганізацыі заняткаў. Гэта:

– практычная (прыкладная) накіраванасць;

– цэласнасць зместу вучэбнай дысцыпліны;

– арыентацыя на асобу студэнта;

– арыентацыя на фарміраванне крэатыўных якасцей асобы студэнта праз развіццё крытычнага мыслення, здольнасцей да аргументаванай крытыкі, ацэнкі інфармацыі;

– адаптацыя прадметнага зместу і рэфлексія, што дае магчымасць асэнсавання спосабаў дзейнасці, вылучэння яе сэнсавых асаблівасцей.

У працэсе выкладання вучэбнай дысцыпліны "Бібліятэчны фандрэйзінг" дасягаецца магчымасць складання студэнтамі індывідуальных адукацыйных траекторый. Вучэбная дзейнасць арганізуецца з выкарыстаннем праектных метадаў і форм праблемнага навучання; увага надаецца самастойнаму вывучэнню новай літаратуры з дапамогай як традыцыйных, так і новых інфармацыйных тэхналогій. Задача выкладчыка – эфектыўна спалучаць універсальныя формы і эфектыўныя спосабы навучання студэнтаў.

---

1. *Бібліятэчны* фандрэйзінг: вучэбная тыпавая праграма для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці 23.01.11 – бібліятэказнаўства і бібліяграфія / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; склад. Ю.А.Пераверзева. – Мн., 2005. – 17 с.

2. *Кірухіна, Л.Г.* Бібліятэчны фандрэйзінг: практычны аспект / Л.Г.Кірухіна // Абласныя бібліятэкі: актуальныя аспекты дзейнасці: навук.-метад. выданне / Нац. б-ка Беларусі. – Мн., 2004. – С. 73–81.

3. *Менеджер* информационных ресурсов: учеб.-метод. пособие / В.К.Клюев [и др.]; под общ. ред. В.К.Клюева. – М.: Литера, 2009. – 328 с.

4. *Пераверзева, Ю.А.* Бібліятэчны фандрэйзінг: курс лекцый / Ю.А.Пераверзева. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 111 с. – Дэп. у ДУ "БелІСА" 14.07.2008 г., № Д 200827.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*5. Поиск* внебюджетных средств для библиотек: справочно- метод. пособие / отв. сост. Н.Ф.Вербина; сост. А.А.Папунина, Т.А.Шевченко; Рос. нац. б-ка. – СПб., 2002. – 191 с.

*6. Пошук* додаткових джерел фінансування бібліотек: программа курсу проблемно-модульного навчання для працівників бібліотек та органів інформації / уклад. В.К.Скнар. – Київ, 2000. – 16 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ